Асобны № каштуя усюды 40 кап.

Працоуны народ усіх краеу—злучайся!

Дзянніца

ВЕСТКА БЕЛАРУСКАГО НАЦЫЯНАЛЬНАГО КАМІСАРЫЯТУ.

КОШТ ГАЗЭТЫ.		
	У РАСЕІ.	ЗА ГРАНІЦУ.
1 м.	1 р. 80 к.	3 р. — к.
2 м.	3 р. — к.	4 р. — к.
3 м.	4 р. 25 к.	6 р. — к.
4 м.	6 р. — к.	8 р. 70 к.
6 м.	8 р. 50 к.	12 р. — к.
9 м.	13 р. 50 к.	18 р. — к.
12 м.	17 р. — к.	20 р. — к.

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некулькі экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52. Тел. 1-51-63.

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ім пярасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідая сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымая і радактар.

№ 36.

Масква, 1918 г. 30 Акцябра. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Ад Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Беларускім Нацыянальным Камісарыятам адчыняны атдзелы Камісарыяту: у г. Вітабску (Суворауская, д. 48), у г. Смаленску (Б. Казанская, 14) і у Петраградзя (Тэатральная, 3). Па справам беларускім радзіцца усім зварочвацца па гэтым адрасом. Там жа прадаюцца беларускія кніжкі і газэта „Дзянніца“.

Б. Н. К.

Да ведама беларусау бежанцау.

Бежанскі атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту мая сваіх прадстаунікау (эмісарау) вось у якіх мейстох: у г. Воршы (Слободская ул., д. Лібстера), т. А. К. Дубіцкі, у г. Тамбовя (Базарная улица, дом 33.) т. І. І. Пузыроу, у г. Саратавя (гасцініца „Асторія“, кв. 78) т. А. Е. Степанюк, у Калузя (пленбеж) т. Васілевіч. Па усім справам, датычным бежанцау, прозьба на местох звертацца да гэтых людзей па упомняных адрысох.

Бежанскі атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Павядамленьня.

З 26 акцябра адбываяцца канфярэнцыя эмісарау і прадстаунікау бежэнскіх атдзелау Беларускаго Нацыянальнаго Камісар‘яту і яго атдзяленьняу; а с 28 акцябра—канфярэнцыя культурна-асьветнаго атдзелу.

Положеніе о помощи жертвам пострадавшим от контр-революціи.

1. Для оказанія помощи жертвам контр-революціи, при Комиссаріатѣ Соціальнаго Обезпеченія образуется временная Центральная Комиссія из представителей Комиссаріатов: Соціальнаго Обезпеченія, Внутренних Дѣл, Военнаго, Высшаго Совѣта Народнаго Хозяйства, Труда, Здравоохраненія, Государственнаго Контроля, Земледѣлія и В. Ц. И, К. На мѣстахъ по тому же принципу образуются, из отвѣтствующих отдѣлов мѣстных Совѣтов, мѣстныя Комиссіи помощи жертвам контр-революціи.

2) Центральная Комиссія распоряжается отпускаемыми правительством кредитами, мѣстныя Комиссіи расходуют их по инструкціям и под контролем Центральной Комиссіи.

3) Задачи Комиссіи:

а) Удовлетвореніе нужды в кровѣ, пищѣ, одеждѣ, медицинской помощи, работѣ и т. д., пострадавшим от контр-революціи трудовым элементам города и деревни и их семействам.

б) Обезпеченіе впавших в постоянную нужду нетрудоспособных и оставшихся без средств к существованію (больных, раненых, инвалидов, осиротѣлых семей, вдов и сирот) и пр.

в) Возстановленіе уничтоженнаго имущества или разстроеннаго как общественнаго, так и частнаго хозяйства трудовых элементов города и деревни.

4) Помощь, оказывается либо в денежной формѣ.

5) Денежная помощь выдается:

а) В видѣ единовременнаго пособія: устанавливаемаго на мѣстах, в зависимости от прожиточнаго минимума, в предѣлах необходимой потребности.

б) В видѣ ежемѣсячных пенсій потерявшим трудоспособность, по нормам Комиссаріата Соціальнаго Обезпеченія.

в) В видѣ помощи на возстановленіе частнаго и общественнаго хозяйства трудовых элементов города и деревни, по заключенію мѣстнаго Комитета помощи и на возстановленіе произведеннаго хозяйства.

Примѣчаніе: Выработка болѣе подробной инструкціи возлагается на Центральную Комиссію.

6) Для помощи жертвам контр-революціи образуется особый фонд.

7) В означенный фонд ассигнуется в видѣ аванса в счет смѣты Народнаго Комиссаріата Соціальнаго Обезпеченія на второе полугодіе 1918 г. 100 милліонов руб.

Народный Комиссар Соц. Обезпеченія: А. Винокуров.

Управляющій Дѣлами Совѣта Народных Комиссаров: Вл. Бонч-Бруевич.

Секретарь Совѣта Народных Комиссаров: Фотіева.

Центральная комиссія по оказанію помощи жертвам контр-революціи.

1. Центральная Комиссія, образуется при Наркомсобез и состоит из представителей Комиссаріатов: В. Ц. И. К., Соціальнаго Обезпеченія, Внутренних Дѣл, Военнаго, Здравоохраненія, Труда, В. С. Н. Х., Контроля и Земледѣлія.

2. Предсѣдателем Центральной Комиссіи состоит завѣдующій Отдѣлом помощи жертвам контр-революціи Наркомсобеза.

3. Дѣлопроизводство Центральной Комиссіи возлагается на Отдѣл помощи жертвам контр-революціи при Наркомсобезѣ.

4. Засѣданіе Центральной Комиссіи происходит не рѣже раза в недѣлю.

5. Центральная Комиссія:

а) вырабатывает инструкціи для мѣстных Комиссій;

б) дает руководящія указанія;

в) разрабатывает план помощи;

г) посылает инструкторов на мѣста;

д) ассигнует кредиты мѣстным Комиссіям;

е) разсматривает жалобы на мѣстныя Комиссіи;

ж) контролирует дѣятельность местных Комиссій.

Принято на засѣданіи Центральной Комиссіи от 9-го сентября 1918 г.

Предсѣдатель Цирлина.

Распоряженія об организаціи при Комиссаріатѣ Соціальнаго Обезпеченія помощи жертвам революціи.

от 20 сентября 1918 года № 62.

1. При Наркомсобез организуется Отдѣл помощи жертвам Контр-Революціи.

2. При Губернских и Уѣздных Отдѣлах Соціальнаго Обезпеченія организуются такіе же Отдѣлы, которые оказывают помощь пострадавшим своей губерніи, или своего уѣзда.

Масква, 30 акцябра.

Тады равалюцыя мая большую значнасць у сваем развіцьці, шчыльней дакратаяцца люцкога жыцьця, калі дух свабоды, які яна нясе с сабою, шырэй і глыбяй ахапляя усе бакі яго. Разбіваючы старыя уклады у адным мейсця і пакідаючы іх у другім-гэтым робіцца ня настаяшчая **пярабудоука**, а толькі **падбудоука**, якая мала карысна, і нават згубна. Гэткімі былі буржуйныя равалюцыі, якія заусягды дакраталіся толькі верхняго слою жыцьця, і праз гэта пяраіначвалі яго крыху, убіраючы яго толькі у новую хварбу, і на сім сыпыняліся. З за гэтаго і скутак іх быу ня дужа вагкім ды хутка згладжвауся жыцьцем, прымаушым нанова праз кароткі час старую ахварбоуку, якая красавалася на ем і да равалюцыі. Толькі што яно пяраіначвала назвы, склад і хворму, а жыло, як і уперад, і праяуляла сябе так сама. Гінула панства адных багачоу, а на іх мейста адбудоувалася панства другіх, а працоуны народ аставауся бяз ніякае выгады, пярамяняючы прыгон адных на прыгон другіх.

Гэткімі былі равалюцыі і Француская у 1789 годзя, і Гэрманская у 1848 годзя, і Турэцкая 1908 годзя і нават Расейская у 1917 годзя, у феуралі. Кожная з гэстых равалюцыяу першым чынам паспасобіла на усю даугату развярнуцца буржуазеі, багатым людзям, рожным гандляром, купцом, прамыслоунікам, развязаушы іх рукі і зняушы дагляд самауладнага правіцяльства. Працоуны ж народ толькі давау сабою сілу дастаць гэту выгаду ля іх, калі ля сябе ад яе няужывау. Вось праз гэта такія равалюцыі і падабаюцца буржуазеі, і яна іх цярпіць, заступаяцца за іх і нічога б ня мела, каб і у ва усем сьвецця яны рабіліся. Інакшаю равалюцыяй есцяка акцяберская равалюцыя у Расеі. Гэта есцяка аднэю с першых равалюцыяу, якія дзе былі, што пярадала уладу працоунаму народу, прынясла толькі яму свабоду і шчасця і пачала будаваць жыцьце па новаму у шыркі і углыб. Сваім шырокім размахам яна здмухая на сваей дарозя усе старыя, трымаючыя развіцьцю поступу хвормы, палі і пярашкоды і творыць ляпейшы парадак. Усякі адзнак прыгону, у чым ен толькі ня хаваяцца, яна зніштожывая на шчэнт і ня абміная ні годнаго кутку жыцьця. Вядома, калі усе пярашкоды поунам панству свабоды боляй усяго і ставяцца багачамі, людзьмі імеючымі, дык і ня дзіва, што па іх балючай усяго і б‘е равалюцыйны штурх, аглуздаушы іх на мейсту. Ня дзіва і тоя, што яны так заядла і воражна настрояны супроць гэтаго вялікаго пяракруту і як мага стараюцца змагацца з яго паглыбленьням.

Акцяберская равалюцыя-сацыяльная равалюцыя—бач гэткая, што пяравяртая ня толькі паказны бок жыцьця, а і усе робячы лепшым і шчасняйшчым, ня толькі **падбудоувая**, а **пярабудоувая** усе наспрэсс. Вось чаму яна так многа мая варагоу сабе і вось чаму ля працоунаго народу яна муся быць так дарага.

Новы супроціу-равалюцыйны акт.

Пошля доугаго перадыху, вымушанаго мяртвецціям дарэмнай, нікому пяпатрэбнай працы, вядомая Беларуская Рада вылязла ізноу наверх і заставіла аб сабе загаварыць. На гэты раз яна надняла свой голас с парогу магілы і голас яе зычыць бяз усякіх надзей, бяз жадных спадзевак, зусім іначай, ніжто было вясною, пры наступя немцау. Пад рады лікуючы настрой абнаглеушаго нямецкаго грашаунічаства, навёдаючы упынку дзікай крывавай прагнасці, у той час беларуская буржуазея і яе папіхачы-сацыялісты-згоднікі, абурэлі ачуваньням спадзеу, што: авось дзядзька немяц, зваяваушы бальшавікоу, і даушы «незалежнасць» Украіня, Финляндзі, Латвіі і др., ня пакіня і іх, рахманых, бедных беларускіх буржуяу. З гэтай мэтай, каб паказаць сваю надзвычайную «лайяльнасць», каб боляй надсебрыцца да іх і вымаліць хоць што—кельвяк спадобная украінскаму і фінлянскаму, яны доуга касніліся да немца. Зразу ня в‘ясніушыя у чым справа, немцы пошля загуторылі з Радай нібы і на сур‘ез і нават сталі патвараць яе незалежніцкім блазнам. Рада задрала нос і голау кверху. Аблашчаная, яна ня мела меры свaей радасці і дайшла ажно да уклонау перад Вільгэльмаю. Але, падаспеушы розрух у эканамічным жыцьці і уздым равалюцыйнаго пачуцьця у нямеччыня, вымусілі павярнуць зіркі нямецкай буржуазеі і ваяунічаства к сабе да дому. Гопыт жа с незалежнасцю—Украіны сперш прынятай імі да сэрца, а потым так надазоліушая, адбівау астатнюю хацень умешвацца у далейшыя справы адбудовы незалежнасцяу. Немцы вырахавалі, што лягчэй аткарасквацца ад Беларусі, дастаушы выкуп за яе ад Савецкаго Правіцяльства і прыняцца за ахову буржуйнаго устрою дома. Гэта вось і прывяло ужо было амярцвелую Беларускую Раду да ажыуленьня. Ідучы узврат па Беларусь бальшавікоу, нясучая адбудова імі савецкай улады і прыхіл ды спагада да яе працоунаго беларускаго народу, улілі у халодныя жылы беларускіх паноу і багацеяу ды рожных чарнасотнікау долю сударжных утрэпау—і Рада прынялася крычаць «крымінал! Ідзе да мяне смерць!» Як гадзюкі, распаузліся яе сябры парожных кашоx і палезлі напава цяраз парогі Скарапацкіх і нямецкіх камандзерау. Гэтак, у Кіяу знарочыста была адпрауляна ад Рады цэлая дэлягацыя з Я. Варонкам і пр. Е. Карскім у кірунку. Дэлягацыя там мела з прадстаунікамі правіцяльства Скарапацкаго шмат гутарак, між якімі была самая важная—гэта аб злучэньні Беларусі з Украінай. Апроч гэтаго, правіцяльству Украіны была урачана дэкляр. пратэсту аб радзелу Беларусі праз дадаткавая замірэньня.

Гэту ж самую дэкляpацыю яна уручыла і прадстауніку расейскай мірнай дэлягацыі, т. Ракоускаму.

Новы супроціу-равалюцыйны акт—вось як можна празваць гэта дзіцятка чорнасотніцкай Беларускай Рады. Весь сэнс дэкляpацыі адчынята воражны савецкай Расеі і усім яе пастановам. Кажучы аб губільнасці дадатачнаго згавору аб замірэньні, па яком нямеччына мусіць ачысціць частку Беларусі услужная немцам Рада распінаяцца ад злосці, што Беларусь нібы та гэтым падзяляяцца! Смѣшна! Калі траха ня уся яна тапталася і руйнувалася нямецкім ботам—дык тады лічылася цэльнай і «Незалежнай», калі ж равалюцыя адваеувая частку яе і збараняя ад загубы, дык—крымінал!—Беларусь дзеліцца «супроціу волі... Рады!»

І рахмана, маучліва ды пакорна згаджаючыся з астауленьням вялікай часткі яе (Гродзяншчыны і Віляншчыны) у руках немцау, Рада спяшыць як мага напрашкодзіць вярнуцца равалюцыі на дэмакрацкую Беларусь. З аднаго боку, разам з памешчыкамі, бяз усякаго разбору нацыяу і кварбы, яна хадайнічая і перад Скарапацкім і перад немцамі ня пакідаць бяз свае апекі нібы „Беларусі“, а с другога—паспешна гуртуя белую гвардзію, у якую запісвая нават сваіх членау. Спагадлівая буржуазея і чорнасотня «братніх» дзяржау ітзе на су-

тібнучым няшчаслівіцам і ахвотня дае грошы і наладжвая гандлёвыя адносіны. Праца, чорная і паганая, ля адбудовы беларускай Скарапаччыны ідзе хуткім крокам. Толькі мабыць задужа мала асталося часу, каб паспець залажыць яе. Ды і час нейкі няпеуны. Па усім свеця нарастая равалюцыйная пачуцьце, а тым болей у Беларусі. Працоуны беларускі селянін, многа ахвяраваушы сілы і працы ля падмацаваньня панства акцыбер-скай равалюцыі, усім сэрцам і істотай спагадаі ей і чакая урочнага часу, калі скутак жыцьціовых з'яу прынясе яе ізноу к яму. А той час ужо блізка і вялікія ліхія сілы ня сустрымаюць яго прыносу.

Беларус-Камуніст.

Каля пытаньня аб агульнум Замірэньні.

Захапляньня германскімі імпэрыялістамі вялікіх частак бышае Расейскі Імперыі пасля таго, як расейскі працоуны народ ня толькі адцураўся ад заваіоваў, але нават ад усякае прыхільнасці да вайны, зрабілася зрадаю і згубаю дзеля самых кіраўнічых палітыкаў Гэрманіі. Тыя вялікія думкі і лёзунгі, якія вырабіла Расейская Сацыяльная Равалюцыя перакінуліся хутка к тым нямецкім салдатам, якімі занятая была Украіна, Беларусь, Літва, Лифляндзія і г. д. Праз іх лёзунгі равалюцыі пераняcліся і у закавулкі рабочых цэнтрау Гэрмані і знайшлі сабе гарачы адгук у сэрцы кожнага працоуніка. Варункі аканамічнага жыцьця, нясьвядомасць, калі скончыцца гэты бязкарысны усціх збою народу з'нуляюцца натта добрым грунтам дзеля пасеву равалюцыі. Што ж датыркаяцца да хаурусьнікау, то, дзякуючы далячыні іх ад горна равалюцыі, Расеі — з аднаго боку — і таму, што там аканамічная палажэньня крыху лепяй, чымся у Гэрманіі — з другога боку — там равалюцыйны рух ня мая яшчэ да часу такое вострасці, хоц працоуны-дэмакрацкія арганізацыі так сама упарта трэбуюць наагульнаго замірэньня.

З-за прычыны такое няаднакавасці палітычнаго і аканамічнаго палажэньня у працоунікау, у вайсковых дзеях перавага перайшла зразу к хаурусьнікам. На усіх фронтах яны павялі рахунковы наступ. Узгараліся цяжкія бойкі. Тады, ня [illegible] рацыя арміі; баугарская армія абурана зусім, і Баугарыя цаною часовае атдачы свае зямлі і дабра купіла замірэньня у хаурусьнікау. У апошнія дні новы мініcцяр іназемных справау Тэуфік-Паша пасылая у Вашынгтон прапанову замірэньня, і Турцыя мусі-быць асобна выйдзя з вайны. Плян Гэрманіі зусім зблутауся, і замест панаваньня «ад Бэрліну да Баграду» гэрманскім імпэрыялістам прыйшлося працягваць руку за мора у Амэрыку, шукаючы згоды. Але ня толькі на поудні кепскія справы дзеля Кайзера і Людэндорфа. На заходнюм фронцэ так сама нямецкія арміі прымушаны адыходзіць; праўда, покуль што у парадку. Вось усе гэтыя заенныя няудачы пры нясупакою народу, уцснутаго юнкерствам і таркнулі руку Макса Бадэнскаго за замірэньням. Прэзыдэнт Вільсон, з'яуляючыся цяпер нейкім бытцам усясьветным аракулам, прадыставау Гэрманіі свае вядомыя усім 14 пунтау згоды, па якім замірэньня магчыма толькі тады як Гэрманія аслабаніць ад сваіх вайскоу усе захопляныя упераді землі.

Адказ з боку Гэрманії на прапанову Вільсона доуга абрахоувався між кірауні-чымі нямецкаю палітыкаю, і напаследак, здаецца, знайшлі яе згоднаю і прыемнаю. Пры гэтым уся нямецкая грамада падзялілася на дзве часткі. Лібералы і дэмакрацкія гурткі падтрымоуваюць адказ урадау, тады як партыя старога парадку і ахвярства выпускаюць лісты с поклікамі вайны да канца. Але гэтыя партыі ня маюць ужо ніякае вагі, тым часам, як увесь гэрманскі і аустрыйскі народ трэбуюць замірэньня. Што ж датыркаяцца да хаурусьнікау, то урады іх маюць агульны погляд на ноту Вільсона і зусім згодны з ею. Грамадзянскія арганізацыі, напрыклад, цэнтровы хаурус прапрацоунікау па большасці знайшлі ноту Вільсона добраю і толькі трэбуюць, каб ня было ніякіх патаемных абавязаных варункау. Калі такія варункі могуць прытрымаць перамовы аб за[illegible] та працоунікі адцураюцца ад [illegible]авішнасці у магучых быць з'явішчах. [illegible]-сацыялістычныя партыі стаяць за тое, каб прыпынак вайсковых дзеяу і перамовы пачаліся бяз якога-б то ня [illegible]

[illegible]

ная замірэньня будзя зробляна ня у доугія часы.

Што ж адчыняяцца перад намі, перад Расеяй з гэтым замірэньням? Шмат смутнаго і цяжкаго, калі рахунак усіой вайне будуць падводзіць тыя урады, якія стаяць цяпер у галаве гасударствау. Ужо ходзяць самыя дрэнныя чуткі на конт Гэрманіі. Прымушаная знішчыцца перад хаурусьнікамі, адцурацца ад усіх заваіоу на заходзя, яна пражэцца вайсці з імі у згоду аб падзеля за кошт расейскіх вобласціоу. Апрыч таго, нямецкія палітыкі лічаць, што Украина, як паклікаушая сама на падмогу сабе нямецкія вайска, ня падходзіць пад разуменьня аккупацыі а, значыцца, да яе і ня датыркаяцца пота Вільсона: з Украины выводзіць вайскоу немцам як выходзіць па-іхняму, ня трэба. Даляй, правіцельства Скарапацкаго, так сама і польская рэгенцкая рада, учора яшчэ абіваушая парогі нямецкіх міністрау, цяпер ужо лагодзіцца да хаурусьнікау, шукаючы у іх падтрыманьня і зааховы у барацьбе з ушчынаючымся ізноу равалюцыйным рухам, перш усяго, і дзеля умацаваньня іх асабістаго государсцвяннаго устрою, другім лікам. Гэтая пярамена туды, аткуль дзьме вецяр, можа мець вахкі паслед: Украіна можа зрабіцца тым «плацдармам» аткуль хаурусьнікі пачнуць наступ на Радавую Расею, карыстаючы тыя вялікія контар-равалюцыйныя сілы, якія зляцеліся туды з усіх бакоу. А што гэта магчыма, падмацоуваяцца тым, што хаурусныя грашаунікі ніколі, пакуль у іх руках будзя уласць і сіла, ня забудуцца аб сваіх пазычках расейскаму царскаму ураду. Яны скарыстаюць свою моц дзеля таго, каб спагнаць свае і звясці рахункі з Радавым устроям.

Вось такія думкі і прымушаюць нас лічыць, што замірэньня на доуга, ці на заусіоды, умацуяцца толькі тады, як першая каменьня пад вугал згоды заложаць іншыя урады, іншыя людзі, а ня тыя, хто кіруя цяпер. І усамдзеля, Вільсон, напрыклад, выстауляя, як закладзіну замірэньня самаапрэдзяленьня народау. Добра, лепшаго ня трэба. Але чаму ж хаурусныя вайска займаюць Баугарыю, чаму вядуцца патаемныя перамовы з зусім ня народным урадам Украйны ці Польшчы, чаму хаурусьнікі на паупочы Расеі, у Сібіры? Самаапрэдзеленьня, дык поуная — ні Гэрманія, ні хаурусьнікі ня павінны займаць чужых зямель. Калі самаапрэдзя-[illegible] замірэньня зробяць ня тыя, хто цяпер пачыная яго рабіць. Калі будзя такі трапунак, што згода зробіцца імі, та Эуропа войдзя у іншую паласу войнау — сацыяльных: імпэрыялісты ня могуць здаволіць ні нацыяльных, ні аканамічных, правоу усіх, замешаных у вайне народау. Нядарма нямецкая сацыял-дэмакрацыя трэбуя ня толькі замірэньня, але і пераустрою усяго гасударсцвяннаго будынку, які ужо спарахнеу і жыць у ім нельза.

М. Н.

ХІТРЫКІ.

С пачатку сучаснае вялізорнае вайны і да апошніх часоу, зацікауляная ею буржуазея усіх краеу і народау нясціханна старалася выдумоуваць рожныя байкі на конт таго, зачым і дзеля чаго ушчата і вядзецца старашэнняйшая ад усіх войнау—гэта вялікая эуропейская вайна. Байкі гэты патрабаваліся і патрабаулюцца ей у мест чорнаго тоустаго тулю, якім яна карысталася зацьміць вочы працоунаму народу, селянам і рабочым, ка настаяшчую сапраудную мэту вайны. Трэба прыкмеціць пры сім, што буржуазея у складаньні сваіх баяк выказала сябе дужа здольнай і талентнай, маючай адмысловую храктыку: у кожнум краю, кожнаму працоунаму народу яго буржуазея выдумоувала асобныя, адметныя ад другіх, байкі і плеткі, каб гэтым лепі ашаламаніць цемны народ, збіць яго с панталыку і нядаць скеміць іх адмысловых хітрыкау. Гэтак, у Расеі старалася буржуазея атыграцца на так звануй браткасці да праваслауных славянау, сербау, (некалі былі і баугары у гэтум ліку), якіх Расея з дауных часоу прызывалася (толькі прызывалася!) апякунамі і абаронцамі. «Вось глядзеця, чэсныя людзі, ліхі аустрыяк напау на малую, бязпомацную Сэрбію, давайця барашць іх! казала яна. Гэрманская буржуазея зварочвалася да свайго працоунаго народу с клічам: „Устаць, хто патрыет свайго ацечаства, на забарону яго ад дзікаго ворагу з усходу, які рынууся, каб зруйнуваць нашу бацькаушчыну—Гэрманьню“. Француская—клікала да ас[illegible] нямецкую заклятым пемцам няшчасную Бельгію. І пад канец, „свабодалюбная“ амерыканская буржуазея, нажыушыся нямерна па кошт вайны, так сама паздрочвала на немцау—як самых глауных віноунікау вайны. Праз свайго правадыра і выбарчаго, празыдэнта Вільсона, яна перш, покуль прычакала моманту улыгацца у вайну, угаворвала ваюючых змірыцца. З-заду ж свайго міралюбнаго настрою, гатовілася да вайны. Такім чынам, буржуазея кожнае стараны, лезучы у вайну, па свайму абманвала народ як спачатку, гэтак і па працягу усяго часу вайны. Та ей патрэбна было рабіць, каб пакорна, бяз усякай супрэчкі рынуць у бойню свае народы. Німа чаго казаць—пляны ей удаліся, як лепі ня трэба: цемны, нясьвядомы у сваей большасці працоуны народ усіх краеу ахвотня паддауся на хітрыя угаворы свае буржуазеі, паверыу ім і пашоу рэзацца за чужыя інтарэсы. Буржуазея цешылася сваей наборы, спрачалася адна с другою за грудамі целау і рэчкамі крыві і далей старалася падтрымоуваць рожныя байкі і казкі, падкрасваючы іх новымі і новымі выдумкамі. І гэткім парадкам справа працягнулася ажно да часу расейскае равалюцыі, калі напор жыцьця раптам адчыніу вочы уперад усяго працоунаму народу Расеі, які, праведаушы з-за чаго вайна, адказауся яе весці. Чарга стаяла за другімі, але прыкладу расейскаго працоуніка ня пяранімау доугі час ні годзін з ваюючых народау. І толькі надоячы прылучыуся народ баугарскі. Тым часам як амярыканская, англіская, так і француская і італьянская буржуазеі маюць яшчэ до сі вагкі уплыу на працоуны народ сваіх краеу, які да таго паддауся іхнюй брэхні, што паслухна ідзе ня толькі супроціу „дзікаго кайзяра і яго падсобніка аустрыяка“, а і супроціу Свабоднае Расеі, якая і вайны ня абвяшчала іхнім краем. Прауда, хітрая буржуазея умея прыспасавацца да моманту і згодна яго вымаганьням, яна складая і пуская у ход свежыя ды свяжэйшыя байкі і казкі. Калі уперад яна задумала пазмагацца паміж сабою за верхауластва у сьвеця — яна карміла працоуны народ аднымі, асобнымі, байкамі. Калі ж цяперака захацела ваяваць і с працоуным, мірным народам Расеі— у яе знашліся іншыя, другія. І вось, на Расею хаурусная буржуазея пляце тоя, [illegible] цоуны народ, вораг працоунаму народу Францыі, Англі і іх прыяцялям і, знача, з ім трэба ваяваць. У свой чарод, нямецкая буржуазея, баючыся бальшавіцтва, мулюя свайму народу страшэннасць і дзікасць бальшавіства і нібыта не лад, які праз яго творыцца пад бокам гэрманьні. Значэ, так сама трэба і немцу ваяваць з расейскім рабочым і селянінам. А разам, буржуазея кожнае стараны брэша на сваіх саціялістау і рабочых за тоя, што яны, праводзячы стачкі, у сябе дома робяць гэта на сваю пагібяль, бо у той час, як яны бастуюць, другія гатовяць на іх кулі і снарады, ня зважаючы на іх забастоуку. Адным словам усягды і усюды буржуазея, карыстаючы грашмі, каб купляць друкаваная слова і цямнатою народу, байкамі і казкамі, брахнею і сплеткамі, старалася і старацца перасварыць працоуны народ рожных краеу і пасеяць сярод яго варожасць. Такім спосабам яна збараняя сябе, адганяя ад сябе і свайго палажэньня увагу іх. Але і гэты спосаб— пярастае служыць ей даляй. С кожным днем, с кожным часам губіць ен свой бывалашні мацунак і з дня на дзень болей і болей правальваяцца. Расейская равалюцыя гэтаму спасобіць, адчыняючы вочы даверыушымся таварышам другіх краеу. І ужо цяперака—маюцца вялікія скуткі. Калі у перад, у пачатку вайны, буржуазея магла даць сабе дазвол паспрачацца за першынство па крыві народу, та цяперака ужо яна збавіла свае патрабаваньня ажно... да самаабароны. Значэ, мслівым [illegible] і чырвоным байкам яе прыходзіць канец: яны ня могуць даляй служыць карысным срэдствам у яе руках. Жыцьцё разбівая іх у шпэлах, толькі датыркаяцца іх пастацы. Німа чаго казаць— яшчэ з гэтым буржуазея магчыма дзе кольвячы і як кольвячы кіравацца, але ужо яно ня надоуга. Дзень ато дня дайходзяць весткі, што ня толькі рабочыя на фабрыках, а і салдаты у войску пачынаюць расплюшчваць вочы і абшукваць сапраудную хварбу дзійснасці жывых з'явішч. Будоуля пекных, [illegible] баяк, складаных буржуазеяю, сыпляцца і сіла трацішча. Недалека той момант, калі густы [illegible]

Годзі!

Доуга гнулі свае спіны,
Доуга пот мы свой лілі
Ля хвабрычнае машыны
І ля панскае зямлі.
Паднявольна мы маучалі,
Паслухнянымі усягды,
Другіх вечна збагачалі,
Ня вылазячы з бяды.
Доуга-доуга, але потым
Дух свабоды ускалыхнуу
Нас ад цiжарнае сноты
І па бой за волю пхнуу.
Сіла спаушая паустала,
Волі промін стау міргаць
І сем'я працоуных стала
Жыцьцям краю кіраваць...
Гэй, дарогу! Гэй, пуціну!
Сіля творчуй вольны ход!
Хто дагэтуль меу кручыну,
Хто ля іншых ліу свой пот—
Прышоу жыцьця адбудову
Нядакладную рабіць!
Устрой вольны, устрой новы
Пад хундамэнт залажыць!
Дзе ліліся пот с крывіою,
Дзе стаяу працоуных стон,
Суцешаючай гудою
Прагудзеу свабоду звон.
І знямелі злыя сілы
І заціх іх рэзвы рух!
Прад свабоды тым свяцілам,
Што разжох працоуны дух!
Хай ліхоя нікня у шчэлях,
Хай каная у цямне;
Смерць вартуючая ушпэлах
Бязпагадна яго стпе.
Свет адчыніт людзям новым,
Будаунічым маладым!
Ля вялікае будовы
Жыцьця шлях адкрыла ім!

Цішка Гартны.

Маленькі фэльятон.

Думкі маркотныя.

Назначаны Беларускаю Радаю пры Расейсум Савецкум Правіцяльству консулам, вярнууся пошля вандроукі па Беларусі да хаты стомляным і знездаволяным. У той самы дзень, калі яго дры-[illegible] адметна усе газэты пісалі, што я консул, назначаны Гэпэральным Сакратарыятам Беларускай Народнай Распублікі пры Савецкуй уладзя, з гэтым павядаміла мяне Беларуская Рада! А тым часам, як відаць, я звычайны, просты чалавек, які і дасюль быу. Але, просты, звычайны! Гады, брахуны, паскуднікі, бач яны, гэты радцы паганыя, толькі падражніліся са мною, пацешылі, нібы дзіця абаранкам. і больш нічога. Нічога — нічагусянькі! Ціж гэта ня крыуда?! Ціж гэта ня здзек?!“ Консул заскрыгітау зубамі, пічапіу мосна кулакі і затрос імі у паветры— ня падняушы галавы: „А мо!.. а мо і ня варта на іх злаваць? Бадай, што ня варта! За вошта? То ж дзеці, вядуць дзіцячую гульню у пязалежнасць, цешацца, каб ня плакаць і немцау забауляць! Выкінулі жарт, пасмяяліся з мяне—ну, та на тоя ж яны дзеці... Дарую ім! Дарую! Няхай ужо з мяне кпяць— уся рауно я чалавек няпрыкметны, смірны і ціхі—пяранясу як-кольвячы“. У консула стау жалобна—прыніжаны настрой і твар адбівау вялікую пакуту яго душы. „Толькі тоя, што я зразу узяу і паверыу! Зарадуваўся і пашоу... бач, хацеу пайсці да савецкіх уласцеу, паказаць ім вярыцяльную грамату, заявіць правы... На вошта была тая радасць? Ці ня абман яна? Вядома абман, уражэньня вяселай душы... А каб жа пашоу ды ня прынялі мяне, ня дапусцілі, куды след? Як бы тады я меу глядзець вачыма? Што б тады я быу бы варт? Ох, як я рад, што хоцькі гэту грамату мне ня давязлі, што яе згубілі па дарозя! Буць ты благаславен той момант, у які яна выпала з запазухі вязучае яе кабеты!“ Консул на гэты раз падняу набажэнны погляд к верху, к столі і, злажыушы рукі выцягнутымі далоньмі, як то робяць молячыся, прабыу так невулькі хвілін. Потым пад піжар'ю думак галава ізноу апала. „А яшчэ, дурніца я, бязмозглы, рабіу пробу наладзіць сваю консульскую працу з маімі таварышамі консуламі грузінскім, польскім і украінскім! Ля чаго гэта? К чаму яно? Пашоу, пару слоу сказау і вышау. Вышау—пачуушы балючы цюк сэрца, што я, хоцькі і консул, а значу меньш меньшаго. І з'я-[illegible] паперы пярад яго носам, бы матылькі, паляцелі уверх. „Яно то дужа цікава быць консулам, прадстаўнікам 15 мільеннаго народу! Першым консулам маладое, вольнае незалежнае Распублікі! Ой, як прыятна! Што ж за дзіва, калі гэта прыемнасць абурыла мяне і пачала кіраваць мною? Хто б мог паспрачацца ей? І я ж ня дужшы за другіх—застауся ахвяраю у крэпкіх абцугох гэтаго салодкаго пачуцьця“. Консул аблізау губы. „Ня кепска было б быць консулам, прымаць прахачоу, мець сілу пярад начальствам, вясці распарадак, датычны свае распублікі! Колькі паважэньня, знатнасці і славы! Ой, як добра!.. Але!..—галава консула апусцілася шчэ ніжай. „Але яно усе—адзін абман, нязбыуныя мары! Той народ, ад чые распублікі я консулам— ніведая нічога ня толькі аба мне як аб консуля, а і аб тым, што ен жыве у некуй народнуй незалежнуй распубліца! Народ стогня ад нямецкаго прыгону, цярпіць ня выказны здзек; мучыцца у ланцугох няволі! Дзе тая народная распубліка?.. Адзін дзяцінец у сяброу смешнае папернае рады вось што яна значэ. Ня боляй і кропкі! Усе, што кінулася мне у вочы на вандроуцы—ясны доказ! Незалежнасць—калі Рада, шапку зняушы, на каленях поузая пярад немцамі! Атрадзеньня—калі у гандлевуй „Беларускуй“ палаце у Кіяве печатка з царскім арлом і сябры палаты—сябры „ісцінна-рускія“. Народная—калі папы Скірмунты і Вярнікоускія верцяць справамі... А я ж сацыяліст с 90 гадоу XIX сталецьця!“ Ці ж ня крыуда мне, ці ж ня горна? Значэ вось хто назначау мяне консулам! Да дзіва, што сьвяты прыпадак падышоу і згубілася грамата, што затрапятала сэрца—вышаушы ад сваіх калегау — грузінськаго, польскаго ды украінскаго консулау. Да дзіва!.. Дзе тоя гэтта дзіва!“ Консул варожа махнуу рукою, пакруціу галавою і плюнуу. „Шкода, што вялікі штырх пяранясла мая душа, што бліснуушая надзея апранулася чорнаю коудраю разуверра! Цяшка і шкода! І хто тут віновян? Я, ці Рада? Рада, каб на яе здрада! Сакратарыят—каб на яго прапад! Вінны яны! Яны, яны, яны!.. Я ня вінават—слабасць заставіла мяне патураць смашнуй абецы!.. Згартуйся, душа мая, на даляй і ня патдайся нічому ліхому! А цяперака суцешайся сэрца тым, што ня толькі я ня консул, а і Скірмунт ня [illegible] кам—буду жыць і даляй ім! Бог ня пакіня. Ня тоя ж вам, пагарднікі! Былі вяльможнымі панамі, а цяперка... Спрахла мае консульства — спрахняца і вы“. І консул мігам падняуся, азірнуу сябе з ног да носу, перакруціуся на аднэй назе і пашоу на двор.

Васа.

Декларация протеста Белорусского Правительства.

Представителем Белорусского правительства в Киеве вручено Украинскому правительству и советской мирной делегации, следующее заявление:

„Великая всемирная война одним из своих последствий имела признание всеми воюющими державами принципа самоопределения народов и возстановления исторически существовавших государственных организаций.

Одним из первых провел этот принцип в жизнь народ Белорусский, который в лице своего полномочного органа—Рады Белорусской народной Республики — об'явил: актом 25 марта с. г.—независимость и неделимость Белоруссия в ея этнографических и исторических границах. Об этом акте белорусское правительство оповестило все великие державы, заявив при этом протест против раздела Белоруссии Брестским договором. Вместе с тем белорусское правительство просило все великие державы признать государственную независимость Белоруссии.

Несмотря на это, последний дополнительный договор, между Россией и Германией, подписанный в Берлине 27 августа с. г., снова наносит удар только что возсозданной белорусской государственной организации, отрывая от нея северо-восточную окраину до реки Березины.

Между тем, население этой территории неразрывно связано и национально, и культурно с остальной частью Белоруссии.

Измученный тяготами войны, разрушившей экономическую и культурную жизнь края и разорвавшей его части, народ Белорусский, [illegible] надежды на возможность своего возрождения только на возсоединении всех белорусских земель и возстановлении своей утраченной государственности, [illegible]

раздел Белоруссии, угрозу своему национальному существованию и перед всем культурным миром требует, чтобы все белорусские земли, как уже очищенные, так и подлежащие отчуждению от немецких оккупированных войск, так и занятые соседними государствами, были отданы независимой Белорусской державе.

Асаблівая дэлягацыя Беларускай Народнай Распублікі у Кіявя.

Ужотыдняу чатэры таму назад у расейскіх газэтах коратка павядамлялася аб тым, што дэлягацыя ад сучаснаго Мінскаго ураду была у Кіявя. Але хто ездзіу туды і дзеля чаго—ня было сказана. У прыпадкова атрыманум нумары газэты „Кіевская Мысль" ад 27 сенцябра г. г. (№ 171) надрукована, што гэтая дэлягацыя прыбыла у Кіяу у складзя чатырох чалавек: Луцкевича, Варонкі, Аусяніка і Лазаровіча. Перш усяго дэлягацыя даведалася да таварыша Ракоускаго, старшога расейскае дэлягацыі аб замірэньні з Украінаю. Апошняму Беларуская дэлягацыя дала свае граматы і засвятчэньня, а так сама і дэклярацыю с пратэстам супроць дадаткавае згоды к замірэньню у Брэстя, па якой Беларусь разрываецца на чатыры кавалкі. Апроч гэтаго, дэлягацыя мела гутарку аб рубяжох Беларусі, аб Любаускум румя, аб далучэньні да Украіны часткі Беларусі (паудзіанныя паветы Міншчыны) і інш. Але усім гэтым мэта дэлягацыі ня была скончана. Дэлягацыя засталася у Кіявя і на далейшы тыдзянь дзеля перамовау па родным пытаньням. Потым дэлягацыя была у таварыша міністра па іназемным справам О. О. Эйтельмача і мела з ім гутарку аб „дзелавых" справах. Пры гэтуй гутарцы быу і начальнік украінскаго гэнеральнаго Штабу.

Вось усе тыя весткі, якія маюцца аб дэлягацыі. Што там гаварылася і рабілася больш, чаго дамаглася дэлягацыя, пакуль што нявядома. Але крыху можна і здагадацца, што там было. У звязку с пераменаю палажэньня Гэрманіі у датырканьні да ваенных справау, с аслабаненьням часткі Беларусі, прыхільнікі незалежнасці пабачым, што незалежнасць трашчыць па усіх рубцох. Надзеі на тую Гэрманію, да якое яны слалі ліслівыя тэлеграмы аб хаурусі, ужо німа. Трэба шукаць іншаго падмацаваньня, іншае падпоркі. Куды ж кінуцца? На Украіну, да Скорападцкаго — балазе яго нельга распазнаць ад нямецкаго генерала ці каменданта. Іон жа, трымаючыся за нямецкі бот, да гэтых часау ніяк ня можа дагаварыцца з расейскаю дэлягацыяй, мяркуючы дыхтаваць апошнюй свае варункі замірэньня. І да гэтых варункау далучая і долю Беларусі, таргуючыся за паудзіонныя паветы Міншчыны.

К гэтаму-та гандліуошчыку і едуць кірауніків Мінскаго ураду са скаргаю на крыуду! Калі ж іон сам крыудзіць! Ці ж можна уважыць гэтую скаргу? Не, да тых часау, покуль іон з'ууляяцца лічбапом Гэрманіі, пакрывалам, за якім хаваяцца нямецкі заханшк-імпэрыяліст і пацешая украінскую дзяржаву ігрышчам у „самасційнасць", велікадзержаунасць і іншыя смачныя прымусы, да тых часоу ніякаго дабра ад дакляраіцыяу правоу народу ня будзя. Але нам здаецца, што мэтаю дэлягацыі і ня была ахова інтарэсау беларускаго процоунаго народу, а свае уласныя выгады Мінскаго ураду. Гэта відаць ужо з таго, што дэлягацыя заявіла пратэст у тав. Ракоускаго аб падзеля Беларусі і аб дадатковуй згодзя, у той самы час, як кожны беларускі селянін толькі і чакая часу, каб найхуччэй выйсці з-падняволі немцау і забараніцца ад знарочыста злучаных незалежнікау. Мінскі урад добра ведая, што дарога Беларусі вядзе ня да Скарападцкаго і панства, а да злучэньня з Расеяй і чымся барджджэй гэтая злучэньня зробіцца. тым горш будзя дзеля іх. Вось і егдзяць і абіваюць чужыя парогі, шукаючы сабе падтрыманьня з боку, а ня у сваіом народзя.

Трэба помніць, што усіо знарочыстая, усіо выдуманая, чаго німа у рэальнум жыцьці, у нейкі час прападзе марня. Незалежнасць—надуйлыты паухір, і жартавань ею з народам натта нядобра у гэтыя трудныя часы!

Из доклада сотрудника Белорусского Национального Комиссариата К. А.

Проверив лично реэвакуацию беженцев на родину и в проезде их через оккупированную местность Белоруссии, я должен сказать, следующее: во-первых, после погрузки беженцев в русской Орше, Комиссии необходимо, при каждой отправке эшелона, вести переговоры с Германской Комиссией и эти переговоры часто задерживают переезд через демаркационную линию от 1 до 3 суток и более, что на беженцах страшно отражается и на этой почве возникают недовольства, как к Русским, так и к Немецким властям. Во-вторых, касаясь Белорусской Комиссии, высланной от самозванной Рады „Белорусской Народной Республики" (так громко себя величающей), можно сказать, что эта Комиссия ничего другого не делает, как только сидит в заманивает к себе беженцев, занимающихся спекуляцией, (которых, как спекулянтов не могут пропускать власти), выдавая им от себя удостоверения, за что берет не менее трех рублей, а то и „по усмотрению".

